Кірыл Касьцян
(Брэма)

БССР: ад геаграфічна-адміністрацыйнай фармацыі да беларускай нацыянальнай адзінкі

Аналіз зьместу канстытуцыйных актаў Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі (БССР) паказвае разьвіцьцё ўсяе савецкае сыстэмы. Нягледзячы на сваю заідэлягізаванасьць, канстытуцыйныя акты БССР зьмяшчаюць сваё трактаваньне гістарычнага шляху беларускага народу і беларускай дзяржаўнасьці. А ўлічваючы той факт, што менавіта з БССР, што існавала на беларускіх землях у розных межах каля 70 гадоў, нарадзілася сучасная беларуская дзяржаўнасьць, канстытуцыйныя акты гэтай дзяржаўнай фармацыі патрабуюць належнай увагі.

У межах гэтага камунікату храналягічна будуць прааналізаваныя наступныя канстытуцыйныя акты:

— Маніфэст аб абвяшчэньні БССР і Канстытуцыя БССР 1919 г.,
— Канстытуцыя БССР 1927 г. і Канстытуцыя БССР 1937 г.,
— Канстытуцыя БССР 1978 г.

Маніфэст аб абвяшчэньні БССР і Канстытуцыя БССР 1919 г.

Аб'яўленая 1 студзеня 1919 г. у Смаленску БССР прыняла сваю Канстытуцыю 3 лютага на Першым Беларускім зьезьдзе Саветаў. Пры далейшым аналізе Маніфэсту і дадзенай Канстытуцыі трэба ўлічваць шэраг гістарычных падзеяў. Па-першае, гэты самы зьезд выказаўся за аб'яднаньне Беларусі і Летувы ў адзіную дзяржаўную фармацыю, праект канстытуцыі якой быў таксама хутка падрыхтаваны, аднак зьбег вайскова-палітычных абставінаў не дазволіў аб'яднанай рэспубліцы аформіцца[1]. Па-другое, калі ў 1920 г. БССР была адноўлена, Другі Беларускі зьезд Саветаў прызнаў Канстытуцыю 1919 г. дзейнай, прыняўшы шэраг дапаўненьняў і паправак[2]. Такім чынам, з фармальнага пункту гледжаньня можна казаць толькі пра адно „абвяшчэньне БССР" у 1919 г., у той час, як падзеі 1920 г. можна трактаваць як „аднаўленьне" ўжо створанай фармацыі. Гэта дазваляе нам абмежавацца аналізам толькі Маніфэсту аб абвяшчэньні БССР і Канстытуцыі БССР 1919 г.

Такім чынам, Маніфэст ад 1 студзеня 1919 г. зьвяртаецца да „тава-

[1] О. И. Чистяков, *Первые советские конституции, 1918-1922*, „Правоведение" 1968, № 5, с. 7-14 (10).
[2] Там жа.

рышаў і братоў рабочых, бедных сялянаў і чырвонаармейцаў Беларусі”[3]. Адпаведна характарызуецца і сутнасьць БССР: „ад сёньняго дню Беларусь — Савецкая Рэспубліка — становіцца Рэспублікай працоўнаго народу рабочых, селянскае бядноты і чырвонаармейцаў Беларусі”, дзе згаданыя групы насельніцтва абвяшчаюцца „вольнымі і поўнапраўнымі гаспадарамі вольнай незалежнай Беларускай Сацыялістскай Рэспублікі”.

Такая інтэрпрэтацыя сутнасьці БССР дазваляе зрабіць шэраг высноваў. Па-першае, у адрозьненьні ад „нацыянальнай” БНР, БССР ад пачатку мае клясавы характар, дзе ўжываньне тэрміну Беларусь мае выразна геаграфічна-адміністрацыйны зьмест. Па-другое, з фразы аб „вольнай і незалежнай” Савецкай Беларусі вынікае неабходнасьць прааналізаваць бачаньне папярэдніх дзяржаўнаых фармацыяў на беларускіх землях у інтэрпрэтацыі стваральнікаў БССР.

Першы абзац маніфэсту яскрава ілюструе гэтую інтэрпрэтацыю. Беларусь „рабочых і бедных селян” прадстаўляецца „горацешнай пакутнай”, „сперша доўгія вехі свайго жыцьця служыўшая сродкам для абагаченьня польскаго вяльможнаго панствапамешчыкаў, зломысных грашавікоў-купцоў і ўсялякіх багацеяў-крывасмокаў, а потым захопляная пад уціск расейскаго крываваго самадзяржаўя з яго гэнераламі і самаўладным чыноўніцтвам (...)”.

Такім чынам, у інтэрпрэтацыі стваральнікаў БССР як Рэч Паспалітая, так і Расейская Імпэрыя трактуюцца аднолькава як няволя беларускага „працоўнага народу”. Пры гэтым, у адрозьненьні ад інтэрпрэтацыі БНР, дзе гэтая няволя мае нацыянальны характар, у выпадку БССР прыгнёт беларускіх земляў у Рэчы Паспалітай і Расейскай Імпэрыі мае выразны дзяржаўна-клясавы зьмест. Пры гэтым, далучэньне беларускіх земляў да Расейскай Імпэрыі трактуецца як захоп. Пра „далюблінскія” дзяржаўныя фармацыі на тэрыторыі Беларусі Маніфэст аніякіх згадак ня робіць. Карыстаючыся лёгікай бальшавікоў можна адназначна сказаць, што „далюблінскія” дзяржаўныя фармацыі на тэрыторыі Беларусі, „вякі цярпеўшай няволю, пакуту і зьдзек”, несьлі гнёт „працоўнаму народу”, але нельга сказаць, ці лічылі беларускія камуністы палітычныя эліты (у іх візіі — паноўныя клясы) этнічна беларускімі.

Варта таксама згадаць пра кантраст у ацэнцы дзейнасьці бальшавікоў і іншых палітычных сілаў, што спрабавалі ўсталяваць кантроль над беларускімі землямі. Таму „паганая Рада [БНР], нямецкая акупацыйная начальства, польскія і ўкраінскія пасяганьня лічацца скінутымі, няістнуючымі і абвяшчаюцца (...) злымі варагамі [ўсяго працоўнага народу], заслужанымі няшчаднай рэвалюцыйнай кары”. Такім чынам, стваральнікі БССР разглядалі свой праект, што будаваўся „на закладзінах камунізму [і] на фундамэнці міжнароднае злукі працоўнаго люду”

як адзіны слушны. Акрамя таго, ад самага пачатку абвяшчэньня БССР яе кіраўнікі не былі гатовыя талераваць іншыя чымся бальшавіцкія формы дзяржаўнай арганізацыі. Аднак, у сьвятле апісаньня „польскіх і ўкраінскіх пасяганьняў" на беларускія землі, а таксама геаграфічна-адміністрацыйнага ўжываньня тэрміну Беларусь стваральнікамі БССР паўстае пытаньне, на якой падставе вызначаліся межы Беларусі. Сам Маніфэст тлумачэньня гэтаму не дае, аднак, Пастанова Першага зьезду КП(б)Б аб межах БССР ад 30 сьнежня 1918 г., што папярэднічала Маніфэсту кажа пра тое, што да БССР мусяць належаць землі, населеныя пераважна беларусамі і дае поўны пералік гэтых тэрыторыяў[4]. Такім чынам, можна зрабіць выснову, што ў дачыненьні да вызначэньня межаў БССР, яе стваральнікі выкарыстоўвалі фактычна тую ж, што і Рада БНР, формулу: „Беларусь — тэрыторыя расьсяленьня беларускай нацыі, дзе яна складае колькасную большасьць". Розьніца, аднак, у тым, што ў адным выпадку этнічная тэрыторыя мусіла быць базай для будаўніцтва нацыянальнай дзяржавы БНР, а ў іншым — абгрунтоўвала стварэньне геаграфічна-адміністрацыйнай фармацыі БССР, заснаванай на камуністычнай ідэалёгіі.

Канстытуцыя БССР 1919 г. — вельмі сьціслы дакумэнт, які адлюстроўвае ваенна-палітычную сытуацыю таго часу[5]. Ён быў значна дапоўнены ў 1920 г., пасьля аднаўленьня БССР, аднак гэтыя дапаўненьні, як зрэшты і ўся Канстытуцыя, утрымліваюць даволі мала элемэнтаў, што тычыліся б паняткаў „народ", „нацыя" і „дзяржаўнасьць". Канстытуцыя базуецца „на ленінскім разуменьні судачыненьняў паміж дэмакратыяй і дыктатурай, разглядаючы савецкую дэмакратыю як дэмакратыю для большасьці і супраць меншасьці, а дыктатуру пралетарыяту — як вышэйшую праяву дэмакратыі"[6]. Адпаведна, арт. 3 Канстытуцыі сьцьвярджае, што „ўлада павінна належаць цалкам і выключна працоўным масам і іх паўнамоцнаму прадстаўніцтву — Саветам працоўных, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў"[7]. Такім чынам, Канстытуцыя замацоўвае клясавую няроўнасьць, у тым ліку праз пазбаўленьне асобных ін-

[3] Тут і далей у артыкуле Маніфэст аб абвяшчэньні БССР цытуецца ў рэдакцыі, зьмешчанай у: И. Н. Кузнецов, В. Г. Мазец, *История Беларуси в документах и материалах*, Минск 2000, с. 340-343.

[4] Тут і далей у артыкуле Пастанова Першага зьезду КП(б)Б аб межах БССР ад 30.XII.1918 г. цытуецца ў рэдакцыі, зьмешчанай у: И. Н. Кузнецов, В. Г. Мазец, *История Беларуси в документах и материалах*, Минск 2000, с. 339-340.

[5] О. И. Чистяков, *Первые советские конституции, 1918-1922*, „Правоведение", 1968, № 5, с. 7-14 (9-10).

[6] Там жа, с. 7-14 (13).

[7] Тут і далей у артыкуле Канстутуцыя БССР 1919 г. цытуецца ў рэдакцыі, зьмешчанай на Нацыянальным прававым партале Рэспублікі Беларусь: http://pravo.by/lawhistory/konst.htm.

дывідаў і групаў „правоў, якія імі выкарыстоўваюцца ва ўрон інтарэсам сацыялістычнай рэвалюцыі” (арт. 16), і разглядае БССР як „свабоднае сацыялістычнае грамадзтва ўсіх працоўных Беларусі” (арт. 5). Адзіным артыкулам, які тычыцца нацыянальнага пытаньня ёсьць арт. 15, які гарантуе ўсім грамадзянам БССР роўныя правы незалежна ад іх нацыянальнай прыналежнасьці і забараняе „прыгнёт нацыянальных меншасьцяў ці абмежаваньне іх раўнапраўя”. Такім чынам, згодна з Канстытуцыяй 1919 г. БССР можна разглядаць як геаграфічна-адміністрацыйную фармацыю, што ажыцьцяўляе дыктатуру пралетарыяту праз уладу Саветаў і месьціцца на тэрыторыі, дзе беларусы складаюць этнічную большасьць.

Канстытуцыі БССР 1927 і 1937 гг.

Дзьве гэтыя Канстытуцыі адлюстроўваюць далейшую эвалюцыю савецкай улады ў БССР, якая на той момант стала адной з рэспублікаў Савецкага Саюзу. Пры падвышэньні ўвагі да нацыянальнага пытаньня, гэтыя два дакумэнты нашмат у чым паўтараюць зьмест Канстытуцыі 1919 г. і амаль не закранаюць элемэнтаў, што тычыліся б паняткаў „народ”, „нацыя” і „дзяржаўнасьць”.

Канстытуцыя 1927 г. базуецца на асноўных палажэньнях яе папярэдніцы і мае на мэце гарантаваць дыктатуру пралетарыяту, зьнішчыць эксплюатацыю і ажыцьцявіць камунізм, „за якім ня будзе ані падзелу на клясы, ані дзяржаўнай улады” (арт. 1)[8]. Такая фармулёўка, бадай, робіць нерэлевантнымі зварот да якой-кольвек гістарычнай дзяржаўнасьці і тэрытарыяльных пытаньняў, бо сам панятак „дзяржаўнасьці” ў пэрспэктыве мусіў быў зьнікнуць. БССР абвяшчаецца як „дзяржава дыктатуры пралетарыяту, якая ажыцьцяўляе свае задачы на падставе зьвязу рабочых і сялянаў” (арт. 2), дзе ўся ўлада належыць саветам рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў (арт. 3), з чаго вынікае, што ўлада ў БССР дагэтуль мае клясавы характар. Акрамя таго, БССР ёсьць складовай часткай СССР, якая мае права выйсьці зь яго складу (арт. 4).

Канстытуцыя 1927 г. гарантуе „поўнае зьнішчэньне нацыянальнага гнёту” і забясьпечвае „свабоднае эканамічнае і культурнае разьвіцьцё і ўздым дабрабыту працоўных усіх нацыянальнасьцяў, што яе насяляюць” (арт. 20.1). Пры гэтым, на тэрыторыі, дзе нацыянальныя меншасьці складаюць большасьць насельніцтва, гарантуецца стварэньне саветаў, „што працуюць на мове дадзенай нацыянальнасьці і як найпаўней уліч-

[8] Тут і далей у артыкуле Канстутуцыя БССР 1927 г. цытуецца ў рэдакцыі, зьмешчанай на Нацыянальным прававым партале Рэспублікі Беларусь: http://pravo.by/lawhistory/konst_1927.htm.

ваюць у сваёй працы нацыянальныя асаблівасьці" (арт. 20.2). БССР гарантуе сваім грамадзянам свабоднае карыстаньне роднай мовай у палітычным і грамадзкім жыцьці, права і рэальную магчымасьць на навучаньне на роднай мове ў школе, а таксама поўнае раўнапраўе чатырох моваў — беларускай, ідышу, расейскай і польскай (арт. 21), на якіх публікуюцца таксама і ўсе заканадаўчыя акты (арт. 23). Адметнасьцю ёсьць той факт, што за беларускай мовай прызнаецца статус мовы „пераважнай для стасункаў паміж дзяржаўнымі, прафэсійнымі і грамадзкімі ўстановамі і арганізацыямі" на падставе значнай колькаснай перавагі беларускай нацыянальнасьці ў насельніцтве БССР (арт. 22).

Такім чынам, Канстытуцыя БССР з аднаго боку гарантавала роўныя палітычныя і сацыяльна-культурныя правы для прадстаўнікоў усіх нацыянальнасьцяў БССР, аднак гэтыя правы мелі выключна клясавы характар, бо тычыліся толькі працоўных, выключаючы ўсе іншыя сацыяльныя групы. Прызнаньне клясавага зьместу ўлады, рэалізаванага ў прынцыпе „ўся ўлада — Саветам", не дазваляе казаць пра нацыянальны характар ўлады ў БССР, а таму ня робіць мажлівым трактаваць БССР як нацыянальную беларускую фармацыю.

Вось чаму, падобна як і яе папярэдніца, Канстытуцыя 1927 г. разглядае БССР як геаграфічна-адміністрацыйную фармацыю, што ажыцьцяўляе дыктатуру пралетарыяту праз уладу Саветаў і месьціцца на тэрыторыі, дзе беларусы складаюць этнічную большасьць. Менавіта таму прызнаньне за беларускай мовай пераважнага статусу ў стасунках дзяржаўных органаў і інстытуцыяў ёсьць нічым іншым, як простай канстатацыяй этнічнай сытуацыі на тэрыторыі БССР.

Наступная Канстытуцыя БССР была прынята ў 1937 годзе і не нашмат адрозьніваецца ад сваёй папярэдніцы, маючы пры гэтым, аднак, шэраг асаблівасьцяў. Падобна як і яе папярэдніца, Канстытуцыя 1937 году разглядае БССР як „сацыялістычную дзяржаву рабочых і сялянаў" (арт. 1) у складзе СССР (арт. 13) з правам свабоднага выйсьця зь яго (арт. 15)[9]. Уся ўлада ў БССР належыць „працоўным гораду і вёскі ў выглядзе Саветаў працоўных дэпутатаў" (арт. 3). Канстытуцыя 1937 г. замацоўвае публікацыю законаў БССР „на беларускай, а таксама расейскай, польскай і ідышы" (арт. 25) і гарантуе раўнапраўе грамадзянаў БССР „незалежна ад іх нацыянальнасьці і расы, ва ўсіх сфэрах гаспадарчага, дзяржаўнага, культурнага і грамадзка-палітычнага жыцьця", караючы паводле закону наўпроставую ці ўскосную дыскрымінацыю на нацыянальнай глебе (арт. 98).

[9] Тут і далей у артыкуле Канстутуцыя БССР 1937 г. цытуецца ў рэдакцыі, зьмешчанай на Нацыянальным прававым партале Рэспублікі Беларусь: http://pravo.by/lawhistory/konst_1937.htm.

Такім чынам, Канстытуцыя БССР 1937 г., падобна як і яе папярэдніца, гарантавала роўныя палітычныя і сацыяльна-культурныя правы для прадстаўнікоў усіх нацыянальнасьцяў БССР. Адсутнасьць слова „працоўны" ці яму падобнага ў кантэксьце сацыяльнага статусу прадстаўнікоў нацыянальнасьцяў не азначае, што гэтыя правы тычыліся ўсіх, незалежна ад сацыяльнага статусу. Па-першае, гэта вынікае з клясавага характару ўлады ў БССР, рэалізаванага ў прынцыпе „ўся ўлада — Саветам", што складаюцца з працоўных гораду і вёскі. Па-другое, арт. 4 Канстытуцыі прызнае факты „ліквідацыі капіталістычнай сыстэмы, скасаваньня прыватнай уласнасьці на прылады і сродкі вытворчасьці і скасаваньня эксплюатацыі", з чаго вынікае зьнікненьне іншых як працоўныя сацыяльных клясаў.

Варта таксама зьвярнуць увагу на пэўныя зьмены ў ацэнцы ролі дзяржаўнасьці ў Канстытуцыях 1927 і 1937 гг. Калі першая зь іх кажа пра зьнікненьне дзяржаўнай улады з наступленьнем камунізму, што робіць нерэлевантным зварот да якіх-кольвек пытаньняў гістарычнай дзяржаўнасьці і тэрыторыі, то другая згадвае пра „вызваленьне беларускага народу ад нацыянальнага прыгнёту царызму, і расейскай імпэрыялістычнай буржуазіі", а таксама пра „разгром беларускай нацыяналістычнай контррэвалюцыі" (арт. 2). З гэтага вынікаюць дзьве акалічнасьці. Па-першае, улады БССР даюць фармальна нэгатыўную ацэнку гістарычнаму знаходжаньню беларускіх земляў у складзе Расейскай Імпэрыі, прычым ня толькі з клясавага, але і нацыянальнага гледзішча, што супадае з ацэнкай гэтага пэрыяду Радай БНР. Па-другое, нэгатыўная ацэнка „беларускай нацыяналістычнай контррэвалюцыі" можа азначаць сярод іншага непрыняцьце ўладамі БССР праекту БНР як беларускай нацыянальнай дзяржаўнай фармацыі, што, улічваючы характар улады ў БССР, толькі падкрэсьлівае адміністрацыйна-тэрытарыяльны зьмест апошняй.

Такім чынам, характар уладаў у БССР паводле Канстытуцыі 1937 г. фактычна паўтарае палажэньні Канстытуцыі 1927 г., улічваючы пры гэтым вынікі эвалюцыі камуністычнай сыстэмы ў БССР за гэтыя 10 гадоў. Таму БССР у вэрсіі Канстытуцыі 1937 г. належыць трактаваць як геаграфічна-адміністрацыйную фармацыю, якая месьціцца на тэрыторыі, дзе беларусы складаюць этнічную большасьць, і дзе ўсталяваная дыктатура пралетарыяту, а ўся ўлада сканцэнтраваная ў руках Саветаў.

Канстытуцыя БССР 1978 г.

Нягледзячы на тое, што ў Прэамбуле да Канстытуцыі БССР 1978 г. згадана пра „пераемнасць канстытуцыйнага развіцця нашай краіны, ідэй і прынцыпаў"[10] як папярэдніц, прааналізаваных вышэй, гэтая Кансты-

[10] Тут і далей у артыкуле Канстутуцыя БССР 1978 г. цытуецца ў рэдакцыі, зьмешчанай на Нацыянальным прававым партале Рэспублікі Беларусь: http://pravo.by/lawhistory/konst_1978_original.htm.

туцыя нашмат адрозьніваецца ад сваіх папярэдніц, шмат у чым адлюстроўваючы рэаліі таго часу, калі яна была прынятая. Аналіз ейнага зьместу дазваляе знайсьці нашмат болей элемэнтаў, якія акрэсьліваюць бачаньне тагачаснымі ўладамі БССР зьместу паняткаў „народ", „нацыя" і „дзяржаўнасьць".

Ужо ў прэамбуле Канстытуцыі згадваецца пра сфармаваную „новую гістарычную супольнасць людзей — савецкі народ" (абз. 2), часткай якой народ БССР сябе ўсьведамляе (абз. 9). На маю думку, гэтую савецкую ідэалягему Брэжнеўскага пэрыяду варта разглядаць у кантэксьце зьместу дадзенай Канстытуцыі, ня робячы, аднак, на ёй адмысловай акцэнтацыі. Таму, у гэтым кантэксьце неабходна зьвярнуцца да абзацу 6 Прэамбулы, згодна зь якім БССР ёсьць „раўнапраўная рэспубліка ў саставе Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, які ўвасабляе дзяржаўнае адзінства савецкага народа, згуртоўвае ўсе нацыі і народнасці для сумеснага будаўніцтва камунізму". Улічваючы спэцыфіку розьніцы паміж нацыямі і народнасьцямі ў кантэксьце СССР, можна зрабіць выснову, што беларусы разглядаюцца як нацыя. Аднак, у кантэксьце Канстытуцыі паняткі „нацыя" і „народ" ня ёсьць тоеснымі.

Згодна з Канстытуцыяй, БССР трактуецца як „сацыялістычная агульнанародная дзяржава, якая выражае волю і інтарэсы рабочых, сялян і інтэлігенцыі, працоўных рэспублікі ўсіх нацыянальнасцей" (арт. 1), уся ўлада ў якой належыць народу і ажыцьцяўляецца праз Саветы народных дэпутатаў (арт. 2). З гэтага вынікае канструкт народу Савецкай Беларусі як усіх грамадзянаў БССР незалежна ад нацыянальнасьці. У зьвязку з гэтым важна адзначыць тое, што Канстытуцыя 1978 г. — першая Канстытуцыя Савецкай Беларусі, дзе народ прызнаны крыніцай улады і, адпаведна, дзе аніводная сацыяльная група ня выключана з дзяржаўнага жыцьця. Канстытуцыя таксама гарантуе роўнасьць грамадзянаў БССР „розных рас і нацыянальнасцей", што сярод іншага забясьпечваецца правам карыстацца роднай мовай і мовамі іншых народаў СССР, караючы паводле закону наўпроставую ці ўскосную дыскрымінацыю на нацыянальнай глебе (арт. 32). Такім чынам, уладу Саветаў у інтэрпрэтацыі Канстытуцыі БССР 1978 г. можна трактаваць як агульнанародную, што абапіраецца на ўсе як сацыяльныя, так і нацыянальныя групы, прысутныя ў Савецкай Беларусі.

Неабходна таксама зьвярнуць увагу на інтэрпрэтацыю гістарычнай дзяржаўнасьці на беларускіх землях, якую прапануе Канстытуцыя 1978 г. У абзацы 3 яе Прэамбулы сьцьвярджаецца, што „[с]таўшы на шлях сацыялістычнай рэвалюцыі, рабочыя і сяляне Беларусі з дапамогай рускага пралетарыяту ўпершыню ў гісторыі здабылі сваю дзяржаўнасць, утварылі Беларускую Савецкую Сацыялістычную Рэспубліку". Такім чынам, БССР разглядаецца як першая беларуская дзяржаўнасьць,

што нават у адсутнасьці наўпроставых згадак пра папярэднія дзяржаўныя фармацыі на беларускіх землях і ўжываньня фармулёўкі „рабочыя і сяляне Беларусі” дае магчымасьць казаць пра „небеларускі” характар папярэдніх дзяржаўных утварэньняў на тэрыторыі Беларусі ва ўспрыняцьці стваральнікаў Канстытуцыі 1978 г.

Такім чынам, БССР у вэрсіі Канстытуцыі 1978 г. належыць трактаваць як агульнанародную дзяржаўную фармацыю, якая месьціцца на тэрыторыі, дзе беларусы складаюць этнічную большасьць, і дзе ўлада належыць народу і ажыцьцяўляецца праз Саветы народных дэпутатаў. Такая канструкцыя дазваляе разглядаць БССР як беларускую нацыянальную дзяржаўную фармацыю.

Высновы

Аналіз канстытуцыйных актаў БССР цалкам адлюстроўвае эвалюцыю камуністычнай сыстэмы ў Беларусі. Пры гэтым, сама БССР у візіі сваіх канстытуцыйных актаў праходзіць шлях ад геаграфічна-адміністрацыйнай фармацыі, што месьціцца на тэрыторыі, дзе беларусы складаюць этнічную большасьць, і дзе ўсталяваная дыктатура пралетарыяту, а ўся ўлада сканцэнтраваная ў руках Саветаў (Маніфэст аб абвяшчэньні БССР і Канстытуцыі БССР 1919, 1927 і 1937 гг.) да агульнанароднага дзяржаўнага ўтварэньня, характарыстыкі якога дазваляюць разглядаць БССР як беларускую нацыянальную дзяржаўную фармацыю (Канстытуцыя БССР 1978 г.).

Пры гэтым, аналіз зьместу канстытуцыйных актаў БССР за выняткам Канстытуцыі 1978 г. не дазваляе знайсьці шмат элемэнтаў, якія акрэсьліваюць бачаньне тагачаснымі уладамі БССР зьместу паняткаў „народ”, „нацыя” і „дзяржаўнасьць”. Паняткі „нацыя” і „народ” згадваюцца толькі ў Канстытуцыі 1978 г. і ня ёсьць тоеснымі. Апошні тэрмін ахоплівае ўсіх грамадзянаў БССР незалежна ад нацыянальнасьці.

Трактаваньне пытаньняў гістарычнай дзяржаўнасьці на беларускіх землях розьніцца ў ці ня кожным з прааналізаваных канстытуцыйных актаў. Маніфэст аб стварэньні БССР разглядае як Рэч Паспалітую, так і Расейскую Імпэрыю як прыгнёт беларускіх земляў, які мае выразны дзяржаўна-клясавы характар. У той жа час пра „далюблінскія” фармацыі нельга сказаць, ці лічылі беларускія камуністы палітычныя эліты гэтых утварэньняў этнічна беларускімі. Канстытуцыя 1919 г. пра аніякую зь папярэдніх дзяржаўнасьцяў наагул ня згадвае. Наступная за ёй Канстытуцыя 1927 г. кажа пра зьнікненьне дзяржаўнай улады з наступленьнем камунізму, што робіць нерэлевантным зварот да якіх-кольвек пытаньняў гістарычнай дзяржаўнасьці і тэрыторыі. У сваю чаргу, Канстытуцыя 1937 г. дае фармальна нэгатыўную ацэнку гістарычнаму знаходжаньню беларускіх земляў у складзе Расейскай Імпэрыі, прычым

ня толькі з клясавага, але і нацыянальнага гледзішча, што супадае з ацэнкай гэтага пэрыяду Радай БНР, пры гэтым даючы ўскосна нэгатыўную ацэнку праекту нацыянальнай дзяржавы БНР. Нарэшце, Канстытуцыя БССР 1978 г. разглядае БССР як першую ў гісторыі беларускую дзяржаўнасьць.

Сярод іншых высноваў варта таксама адзначыць той факт, што на самым пачатку існаваньня БССР, пры вызначэньні межаў гэтай фармацыі яе стваральнікі выкарыстоўвалі тую ж, што і Рада БНР, формулу: „Беларусь — тэрыторыя расьсяленьня беларускай нацыі, дзе яна складае колькасную большасьць”, з той розьніцай, што ў выпадку БНР гэтая тэрыторыя была б падмуркам для будаўніцтва нацыянальнай дзяржавы, а ў выпадку БССР яна сталася падмуркам для геаграфічна-адміністрацыйнай фармацыі БССР, заснаванай на камуністычнай ідэалёгіі, якая зь цягам часу эвалюцыянавала ў беларускую нацыянальную дзяржаўную фармацыю.

Kirył Kaścian — doktorant prawa na Uniwersytecie w Bremie, absolwent Wydziału Stosunków Międzynarodowych Białoruskiego Uniwersytetu Państwowego w Mińsku i Uniwersytetu w Bremie (dyplom magisterski z prawa międzynarodowego i europejskiego). Twórca i redaktor czasopisma internetowego „The_Point Journal”, redaktor strony internetowej czasopisma „Belarusian Review”.